13. Чурилина, Л. Н. Языковая личность в художественном тексте / Л. Н. Чурилина. — М. : Флинта : Наука, 2011. — 240 с.

***Female language personality in film discourse (on the basis of the film version of the novel “Anna Karenina” by L. N. Tolstoy)***

*The article deals with film discourse as a space for realization of the communicative activity of language personality. The results of the analysis of the verbal-semantic level of female language personality structure are presented on the basis of the 1967 film version of the novel “Anna Karenina” by L. N. Tolstoy.*

*After analyzing quantitative data the authors come to the conclusion that the studied language personality possesses some features that are not typical of female speech, i. e. verbs prevail over other macroclasses in number of positions. Meanwhile pronouns are the largest group in use, which can be explained by the fact that they represent verbal means of explication of elements of the modeled communicative situation.*

**УДК 7.097:339.92(4/5)**



***© Сяргей Венідзіктаў***
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Магілёўскага інстытута МУС, кандыдат філалагічных навук, дацэнт (Беларусь)*

**© Sergei Venidiktov**
*Head of the Department of social and humanitarian disciplines of the Mogilev institute of MIA, PhD in Philology, Associate professor (Belarus)*
*e-mail: venidiktov@institutemvd.by*

# МЕДЫЯКАМУНІКАЦЫЯ Ў ЕЎРАЗІЙСКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ САЮЗЕ: СФЕРНЫ ПАДЫХОД ДА АНАЛІЗУ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

*Артыкул адлюстроўвае даследаванне камунікацыйнай інтэграцыі дзяржаў Еўразійскага эканамічнага саюза. У працы вылучаюцца і паслядоўна аналізуюцца чатыры сферы ўзаемадзеяння інфармацыйных сістэм дзяржаў Саюза: а) сфера дзейнасці СМІ; б) сфера прававога рэгулявання медыя; в) грамадзянская супольнасць; г) сістэма медыяадукацыі. Працэсы ў пера-*

*лічаных сферах уплываюць на эфектыўнасць фарміравання адзінай медыякамунікацыйнай прасторы ЕАЭС.*

Пытанне аб рэсурсах і мадэлях інтэграцыі ў межах Еўразійскага эканамічнага саюза (далей — ЕАЭС) як міждзяржаўнага аб'яднання інавацыйнага фармату актуалізавалася ў навукова-палітычным дыскурсе ў 2017 г. у сувязі з ростам супярэчнасцей паміж удзельнікамі Саюза. Становіцца відавочным, што палітычная воля не можа выступаць адзінай і дастатковай умовай дзейснага збліжэння дзяржаў: па-за ўзаемадзеяннем на ўзроўні грамадзянскіх структур і медыйна-інфармацыйных сістэм любое супрацоўніцтва ў міждзяржаўным маштабе фармалізуецца.

Калі ў выпадку з эканамічным супрацоўніцтвам у межах ЕАЭС выбар сфер, якія валодаюць інтэграцыйным патэнцыялам, вызначаецца наяўнасцю ўзаемадапаўняльных галін, відаў вытворчасці з высокім узроўнем канкурэнтаздольнасці, патэнцыялам стварэння «галін будучыні», магчымасцю дзяржаўнага кантролю, то для медыякамунікацыйнага ўзаемадзеяння актуальны іншы падыход: вызначэнне сфер стварэння, мадыфікавання, цыркулявання, спажывання і рэгулявання масавай інфармацыі. Камунікацыйнае ўзаемадзеянне ў межах ЕАЭС не абмяжоўваецца медыйнай сферай, аднак прадвызначаецца інфармацыйным полем інтэграцыйнага аб'яднання: «Камунікацыя паміж дзяржавамі і шматнацыянальным кантынгентам яго грамадзян фарміруе новую маштабную супольнасць людзей, аб'яднаных адзінымі мэтамі і задачамі павышэння ўзроўню і якасці жыцця, захавання і развіцця нацыянальных культур» (пераклад наш. — *С. В.*) [1, с. 6].

Праведзены намі аналіз дазваляе вылучыць сферы ўзаемадзеяння дзяржаў ЕАЭС, працэсы ў якіх прадвызначаюць эфектыўнасць фарміравання адзінай медыякамунікацыйнай прасторы інтэграцыйнага аб'яднання. Да такіх мы адносім: а) сферу дзейнасці СМІ; б) вобласць прававога рэгулявання функцыянавання медыясферы; в) грамадзянскую супольнасць; г) сістэму медыяадукацыі.

Найбольш значным патэнцыялам у інтэграцыйных працэсах валодаюць медыйныя сістэмы дзяржаў ЕАЭС, узаемадзеянне якіх у доўгатэрміновай перспектыве накіравана на фарміраванне адзінай інфармацыйнай прасторы (далей — АІП). Стварэнне АІП у межах ЕАЭС дазволіць «ажыццявіць наднацыянальны інтэграцыйны механізм на ўсіх узроўнях гаспадарання: на мікраўзроўні, на ўзроўні прыняцця і на ўзроўні ажыццяўлення агульнай эканамічнай палітыкі дзяржаў» (пераклад наш. — *С. В.*) [2, с. 72]. Перспектыўнае фарміраванне АІП у межах еўразійскага інтэграцыйнага праекту прадугледжвае ўніфікацыю механізмаў стварэння і функцыянавання фарматаў медыяінфармацыі, свабоднае цыркуляванне

інфармацыйных плыняў, правядзенне ўзгодненай інфармацыйнай палітыкі, інфармацыйнае раўнапраўе ўдзельнікаў ЕАЭС [2].

СМІ выступаюць таксама рэсурсам фарміравання спрыяльнага інфармацыйнага поля для рэалізацыі стратэгічных напрамкаў інтэграцыі. Як паказвае вопыт дзейнасці ЕС у напрамку камунікатыўнай інтэграцыі, прабелы ў інфармацыйным забеспячэнні эканамічных ініцыятыў могуць стаць крытычнымі для грамадзянскага ўзаемадзеяння. Відавочна, мэтазгодная перспектыва стварэння адзінага рынку працы, тавараў і капіталу ЕАЭС можа сутыкнуцца з пярэчаннямі насельніцтва, што звязана з рызыкай фінансавай экспансіі звонку, недастатковай канкурэнтаздольнасцю ўласнай прадукцыі, суб'ектыўным непрыманнем замежнай працоўнай сілы [3, с. 118]. З гэтага пункту гледжання стварэнне спрыяльнага медыйнага фону інтэграцыйных працэсаў з'яўляецца найважнейшай задачай дзяржаў ЕАЭС.

Фарміраванне эфектыўнай сістэмы ўзаемадзеяння ў медыясферы ЕАЭС павінна адбывацца з улікам шэрагу прынцыпаў, сярод якіх: а) права кожнай дзяржавы ЕАЭС на незалежнае фарміраванне сваёй інфармацыйнай прасторы; б) гарантыі інфармацыйнай бяспекі; в) імкненне да ўзаемавыгаднасці міжкраінавых інфармацыйных абменаў; г) эканамічная мэтазгоднасць стварэння інфармацыйнай інфраструктуры; д) прыярытэт нацыянальных інтарэсаў з улікам норм міжнароднага права пры выпрацоўцы падыходаў да супрацоўніцтва; е) забеспячэнне навукова-тэхнічнай падтрымкі медыясферы; ж) узгадненне падыходаў да прававога забеспячэння інфармацыйнага ўзаемадзеяння; з) роўнасць правоў дзяржаў на доступ да інфармацыі інтэграцыйнага зместу [2].

Нявырашаным з'яўляецца пытанне аб дапушчальнай ступені інтэграцыі медыяінфармацыйных сістэм дзяржаў — удзельніц ЕАЭС. З аднаго боку, максімальная ўніфікацыя стандартаў масавага інфармавання прывядзе да інтэнсіфікацыі працэсу фарміравання АІП. З іншага боку, яна можа запатрабаваць глыбокіх структурных змяненняў у асобных медыясістэмах, якія не заўсёды адпавядаюць нацыянальным інтарэсам і прынцыпам інфармацыйнай незалежнасці.

Важнай сферай фарміравання АІП інтэграцыйнага аб'яднання выступае сфера прававога рэгулявання. Забеспячэнне свабоды перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталу і працоўнай сілы ў межах Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Расіі як асноўны напрамак рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі патрабуе правядзення скаардынаванай палітыкі як у розных галінах эканомікі, так і ў іншых сферах. У пагадненні аб ЕАЭС выкарыстоўваецца паняцце «гарманізацыя заканадаўства», якое прадугледжвае збліжэнне заканадаўчых сістэм дзяржаў, накіраванае на ўстанаўленне падобнага (супастаўляльнага)

нарматыўнага прававога рэгулявання. Зыходзячы з таго, што ЕАЭС не з'яўляецца ўтварэннем палітычным, заканадаўчая ўніфікацыя закранае ў першую чаргу, функцыянаванне адзінай эканамічнай прасторы, дзе існуюць механізмы рэгулявання, заснаваныя на рынкавых прынцыпах і выкарыстанні гарманізаваных і ўніфікаваных прававых норм. Аднак для гарманізацыі заканадаўства ЕАЭС неабходна ліквідаваць больш за 400 бар'ераў, з якіх значная частка — эканамічныя [4].

Уніфікацыя тарыфаў, мер нетарыфнага рэгулявання, каардынацыя ўнутранага эканамічнага заканадаўства, з аднаго боку, прыводзяць да развіцця міжнароднай кааперацыі ў межах ЕАЭС, з другога боку, актывізуюць сістэму камунікацыі паміж дзяржавамі-партнёрамі. Узаемаабумоўленае з функцыянаваннем медыясферы камунікацыйнае ўзаемадзеянне ўпісваецца ў рамкі, устаноўленыя актуальнай сістэмай прававога рэгулявання, і, адпаведна, абмяжоўваецца імі. Эканамічныя ініцыятывы, праграмы і праекты, пазбаўленыя інфармацыйнага падмурку і медыйнай падтрымкі, нярэдка аказваюцца малаэфектыўнымі.

Пры гэтым у розных дзяржавах Саюза выкарыстоўваюцца розныя падыходы да прымаемых органамі ЕАЭС рашэнняў, якія вызначаюць іх месца ў сістэме нацыянальнага заканадаўства. Напрыклад, у Расіі існуе прыярытэт рашэнняў міжнародных арганізацый у адносінах да расійскага заканадаўства, аднак рашэнні еўразійскіх органаў не з'яўляюцца міжнароднымі дамовамі. У сувязі з гэтым мы падтрымліваем пазіцыю С. В. Бахіна, які ўзнімае пытанне аб важнасці ўстанаўлення іерархіі паміж нацыянальным правам, інтэграцыйным правам і часткай міжнароднага права [5]. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь акты міждзяржаўных аб'яднанняў у нацыянальнай сістэме права маюць падзаконны характар. Пасля заключэння міжнародных дагавораў на іх аснове дадзеныя акты набываюць больш высокі статус, ідучы за Канстытуцыяй і канстытуцыйнымі законамі [6]. Міжнародныя дамовы, ратыфікаваныя Казахстанам, атрымліваюць прыярытэт перад нацыянальнымі законамі, а прынятыя міжнароднымі арганізацыямі (у т. л. ЕАЭС) і іх органамі акты аўтаматычна ўваходзяць у структуру нацыянальнага заканадаўства. У выпадку наяўнасці супярэчнасцей паміж актамі Еўразійскай эканамічнай камісіі і заканадаўствам Казахстана прыярытэт мае інтэграцыйнае права [7, с. 95]. Таму для эфектыўнай інтэграцыі ў прававой сферы ЕАЭС уяўляецца неабходнай выпрацоўка адзіных падыходаў да ўзгаднення нацыянальных прававых сістэм і рашэнняў органаў кіравання інтэграцыяй.

Такім чынам, гаворку варта весці аб сіметрычным, скаардынаваным развіцці заканадаўства ЕАЭС у эканамічнай і камунікацыйнай сферах. Узаемадзеянне дзяржаў ЕАЭС у інфармацыйна-камунікацыйнай сферы

павінна гарантаваць «захаванне самабытнасці, самадастатковасці, арыгінальнасці і непаўторнасці культурна-цывілізацыйнага феномену асобных краін, <…> выбудоўванне адносін з культурамі і рэлігіямі на аснове дыялогу, полікультурнасці, талерантнасці, поліканфесійнасці» (пераклад наш. — *С. В.*) [2, с. 38].

Функцыянаванне медыйных сістэм дзяржаў ЕАЭС будзе эфектыўным пры ўмове адначасовай эвалюцыі грамадзянскай супольнасці як сферы цыркулявання масавай інфармацыі і рэалізацыі медыякамунікатыўных кампетэнцый. Інтэграваны соцыум не можа паспяхова існаваць і развівацца без інфармаваных і ангажаваных грамадзян, адкрытых для інавацыйных тэхналогій. Нягледзячы на тое, што асноўная адказнасць за рэалізацыі інтэграцыйных інтарэсаў ляжыць на ўрадах дзяржаў ЕАЭС, нельга адмаўляць важнасці ўдзелу ў выпрацоўцы стратэгічных рашэнняў арганізацый і структур грамадзянскай супольнасці.

Грамадзянская супольнасць як сфера інтэграцыі з’яўляецца асяроддзем фарміравання дамінуючага ў канкрэтным соцыуме тыпу інфармацыйных паводзін асобы. У гэтай сферы адлюстроўваецца стаўленне грамадзян да інтэграцыйных працэсаў, якое праяўляецца ў падтрымцы альбо дыстанцыраванні ад ЕАЭС, а таксама ў практыках гуманітарнага ўзаемадзеяння. Даследаванне медыякамунікацыі ў структурах грамадзянскай супольнасці ЕАЭС дазволіць вызначыць напрамкі актывізацыі грамадскага ўдзелу ў інтэграцыйных працэсах з дапамогай стварэння аптымальнай сістэмы інфармацыйнага ўзаемадзеяння. У цяперашні час ступень уплыву грамадзянскай супольнасці на інтэграцыйныя працэсы можна ахарактарызаваць як нязначную (пры гэтым гуманітарная інтэграцыя развіваецца пераважна на побытавым узроўні), што можна растлумачыць інертнасцю сацыяльных структур, а таксама прабеламі ў інфармацыйным забеспячэнні міждзяржаўнага ўзаемадзеяння. У той жа час эксперты адзначаюць, што еўразійская інтэграцыя павінна прывесці да пазітыўных змен у грамадзянскай супольнасці: «Гэта імпульс для таго, каб розныя напрамкі грамадзянскай супольнасці былі на парадку дня. Другі момант — гэта сацыяльная мадэрнізацыя. <…> Важна данесці, што значыць “інтэграцыя” для нас і як гэта адаб’ецца на будучыні ў цэлым» (пераклад наш. — *С. В.*) [8]. Адзін з перспектыўных напрамкаў у гэтай сувязі — стварэнне механізма ўдзелу грамадзян ЕАЭС у выпрацоўцы і прыняцці рашэнняў інтэграцыйнага характару, якія рэгулююць як палітычнае, так і гуманітарнае ўзаемадзеянне.

Звяртаючыся да досведу іншых інтэграцыйных утварэнняў, адзначым, што важнымі наступствамі інтэграцыі для грамадзянскай супольнасці ў дзяржавах ЕС сталі: развіццё прававатой і грамадзянскай

культуры, пашырэнне грамадзянскага ўдзелу і павышэнне ініцыятыўнасці насельніцтва, дасягненне неабходнага ўзроўню сацыяльнай падтрымкі рэформ, фарміраванне сеткі міждзяржаўнага супрацоўніцтва. Іншымі словамі, інтэграцыйныя працэсы ў ідэале прыводзяць да актывізацыі ўжо існуючых структур грамадзянскай супольнасці і ствараюць умовы для ўзнікнення новых, а медыякамунікацыя на ўзроўні лакальных структур мае на мэце павышэнне эфектыўнасці інтэграцыйных працэсаў у нацыянальным і ў міжнацыянальным маштабах.

Грамадзянская супольнасць з’яўляецца асяроддзем развіцця сістэмы грамадзянскай камунікацыі і падтрымання яе аптымальнага стану, што актуалізуе пытанне аб рэсурсах фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці грамадзян. Ва ўмовах медыятызацыі грамадскага жыцця дакладней будзе весці гаворку аб медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці, сферай фарміравання якой выступае сістэма медыяадукацыі. Найбольш агульная задача медыяадукацыі — навучыць грамадзян арыентавацца ў інфармацыйных плынях, найбольш агульнае вызначэнне медыяграматнасці — здольнасць да кваліфікаванага, творчага і самастойнага дзеяння ў адносінах да медыя [9]. Усё гэта з’уляецца асновай эфектыўнай медыйнай камунікацыі як інтэграцыйнага рэсурсу.

Супярэчлівая сітуацыя, што складваецца вакол медыйнага вобразу ЕАЭС у свядомасці разнастайнай і раз’яднанай аўдыторыі, пацвярджае тэзіс: інфармацыйнае забеспячэнне інтэграцыйных працэсаў у транснацыянальным маштабе не можа быць эфектыўным без належнага ўзроўню медыяінфармацыйнай падрыхтоўкі грамадзян. У сітуацыі інфармацыйнага процiборства дадзены кірунак, які рэалізуецца пры дапамозе развіцця медыяадукацыі, становіцца важным элементам нацыянальнай бяспекі. Ва ўмовах эвалюцыі ЕАЭС медыйная пісьменнасць здольна кампенсаваць прабелы ў інфармацыйным забеспячэнні міждзяржаўнага ўзаемадзеяння, сфарміраваць мадэлі актыўнасці структур грамадзянскай супольнасці, прадвызначыць стаўленне насельніцтва да палітычных рашэнняў і ініцыятыў, выступаючы, такім чынам, у якасці інтэграцыйнага рэсурсу.

Інтэграцыйная функцыя ў поўнай меры адпавядае зместу новай камунікатыўнай канцэпцыі медыяадукацыі, заснаванай, у сваю чаргу, на паняцці наасфернай адукацыі. У аснову новай канцэпцыі закладзена ідэя глабальнай узаемазалежнасці ўдзельнікаў інфармацыйнага абмену: «Асноўная мэта [медыяадукацыі — *С. В.*] складаецца ў развіцці мірнага грамадства. Стварэнне глабальнай ідэнтычнасці павінна быць гарманізавана з ідэямі культурнай разнастайнасці. <…> Медыйная граматнасць грамадзян глабальнага інфармацыйнага грамадства можа

зрабіць унёсак у пашырэнне гэтых каштоўнасцей» (пераклад наш. — *С. В.*) [10, с. 141].

На лакальным і рэгіянальным узроўнях інтэграцыйны патэнцыял медыяадукацыі рэалізуецца праз умацаванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, стымуліраванне праяў розных форм грамадзянскай актыўнасці ў грамадскіх структурах, актуалізацыю лакальных праблем, усталяванне эфектыўных мадэлей узаемадзеяння рэгіянальных СМІ і аўдыторыі, а таксама разуменне супярэчнасцей у прынцыпах дзейнасці медыя living розага ўзроўню. У выніку адбываецца фарміраванне сацыяльна арыентаванага медыяасяроддзя, у якім рэалізуецца медыяактыўнасць грамадзян, заснаваная на ўсвядомленай патрэбе ў сацыяльна карыснай дзейнасці, і закладваецца базіс медыябяспекі грамадства.

На міжнацыянальным узроўні інтэграцыйная функцыя медыяадукацыі забяспечвае адзінае разуменне глабальных медыятэкстаў (незалежна ад сацыякультурных адрозненняў аўдыторыі), уменне бачыць палітычны і ідэалагічны падтэкст у паведамленнях, выяўляць схаваныя інтарэсы актораў палітычнай сферы. Як сцвярджае ЮНЕСКА, «інтэрнацыяналізм і прызнанне культурнай разнастайнасці магчымыя, калі грамадзян цікавіць усё, што адбываецца ў свеце, і яны ўсведамляюць глабальныя маштабы сусветных праблем. Толькі медыяарыентаванае грамадскае асяроддзе, якое задае кірунак чалавечай дзейнасці, можа садзейнічаць з’яўленню грамадзянскай супольнасці новага тыпу» (пераклад наш. — *С. В.*) [10, с. 141]. Іншымі словамі, медыяадукацыя забяспечвае сацыяльную падтрымку аб’ектыўна жыццяздольных інтэграцыйных праектаў.

У рэалізацыі медыяадукацыйных праграм неабходна ўлічваць і тое, што ўмовы глабалізацыі сусветнай палітычнай, эканамічнай і інфармацыйнай прасторы, распаўсюджванне мультыэтнічнасці і мультыкультурнасці, узрастанне ролі тэхналогій робяць як ніколі актуальнай праблему захавання нацыянальнай ідэнтычнасці. У такой сітуацыі непазбежна ўзнікненне супярэчнасцей паміж унутраным вобразам дзяржавы, яго «ідэальным іміджам», што культывуецца палітыкамі і падтрымлівае ўстойлівасць грамадскай сістэмы, і вобразам знешнім, стыхійна ўтвораным або наўмысна сфарміраваным СМІ іншых (у т. л. партнёрскіх) дзяржаў. Зыходзячы з таго, што культурныя каштоўнасці народаў Еўразіі занадта разнастайныя, неабходна вучыць грамадзян (аўдыторыю СМІ) успрымаць культуралагічны кантэкст інтэграцыі. Тады камунікатыўная інтэграцыя, заснаваная на медыякампетэнтнасці, зможа кампенсаваць недахопы палітычных аб’яднанняў, вырашаючы іх задачы на мікраўзроўні эканамічнага, гуманітарнага, культурнага ўзаемадзеяння. Такі «ўзыходзячы» вектар інтэграцыі грунтуецца на традыцыйных культурных

сувязях, моўнай блізкасці, талерантным стаўленні да прадстаўнікоў «сваіх» этнасаў, узаемавыгадным эканамічным супрацоўніцтве на ўзроўні малога і сярэдняга бізнесу, псіхалагічным адчуванні дачынення і суперажыванні падзеям у дзяржавах-партнёрах, важкім фактарам чаго становіцца дзейнасць медыя (у т. л. у напрамку развіцця медыйнай граматнасці грамадзян).

Лагічна ў гэтай сувязі прагучыць тэзіс аб тым, што медыякамунікатыўны рэсурс інтэграцыі еўразійскай прасторы звязаны са знаходжаннем балансу паміж інстытуцыйнай і нефармальнай кааперацыяй, аптымізацыяй палітычнага ўдзелу рэгіянальных медыяструктур, з развіццём інфармацыйнай інфраструктуры інтэграцыйных праектаў і камунікатыўнай кампетэнтнасці грамадзян. Мадэль аптымальнага міждзяржаўнага інфармацыйнага ўзаемадзеяння ўключае ў сябе тры ўзроўні: знешні, унутраны і тэхналагічны [11]. Знешняе інфармацыйнае ўздзеянне забяспечвае распаўсюджванне еўразійскай ідэалогіі і культуры, фарміраванне адзінага разумення гістарычнага працэсу, аптымізацыю іміджу рэгіёну ў свеце, інфармацыйнае процідзеянне магчымым тэндэнцыям дэзынтэграцыі. Унутраны ўзровень арыентаваны на міжэтнічную камунікацыю, супрацоўніцтва палітычных эліт, свабоднае цыркуляванне інфармацыйных плыняў. Тэхналагічны ўзровень інтэграцыі павінен з дапамогай інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій стварыць магчымасці для выкарыстання медыя ў развіцці адзінай інфармацыйнай прасторы за кошт мабільнасці, аператыўнасці, інтэрактыўнасці новага медыяасяроддзя.

Такім чынам, пасляховасць інтэграцыйных працэсаў у ЕАЭС шмат у чым вызначаецца актыўнасцю актораў у асноўных сферах медыякамунікацыйнага ўзаемадзеяння, гатоўнасцю да аб’яднання нацыянальных і міжнацыянальных інтарэсаў. У цяперашні час мэтазгодна весці гаворку аб адносна ізаляваных сферах медыякамунікацыйнага ўзаемадзеяння, ацэнка сукупнага эфекту якіх магчымая зыходзячы з патрэб стварэння адзіных механізмаў рэгулявання інтэграцыйных адносін у кантэксце сінергетычнай парадыгмы.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Слука, О. Г. Эволюция евразийского информационного пространства / О. Г. Слука // Thesaurus : зборнік навуковых прац ; пад агул. рэд. С. В. Венідзіктава. — Вып. III : Інфармацыйна-прававое поле еўразійскай інтэграцыі. — Магілёў : Магілёўскі інстытут МУС, 2016. — С. 3–12.

2. Якушенко, К. В. Концептуальные основы формирования единого информационного пространства в Евразийском экономическом союзе / К. В. Якушенко // Thesaurus : зборнік навуковых прац ; пад агул. рэд.

С. В. Венідзіктава. — Вып. III : Інфармацыйна-прававое поле еўразійскай інтэграцыі. — Магілёў : Магілёўскі інстытут МУС, 2016. — С. 71–81.

3. Кондратьева, Н. Б. Таможенный союз ЕврАзЭС: по стопам Европы? / Н. Б. Кондратьева // Современная Европа. — 2009. — № 3. — С. 102–118.

4. Более 400 барьеров необходимо устранить для гармонизации законодательства ЕАЭС — Мясникович [Электронный ресурс] / БелТА: информационное агентство. — Режим доступа: http://www.belta.by/economics/view/bolee-400-barjerov-neobhodimo-ustranit-dlja-garmonizatsii-zakonodatelstva-eaes-mjasnikovich-202950-2016/. — Дата доступа: 20.02.2017.

5. Бахин, С. В. Международная составляющая правовой системы России / С. В. Бахин // Правоведение. — 2007. — № 6. — С. 126–137.

6. Василевич, Г. А. Международное право и национальное законодательство / Г. А. Василевич. — М. : Эксмо, 2009. — 704 с.

7. Правовые проблемы формирования межгосударственных объединений (на примере Зоны свободной торговли и Таможенного союза ЕврАзЭС) : монография / Институт законодательства и сравнительного правоведения при Правительстве Российской Федерации ; отв. ред. В. Ю. Лукьянова. — М. : НИЦ ИНФРА-М, 2012. — 336 с.

8. Евразийская интеграция позитивно скажется на развитии гражданского общества: эксперты [Электронный ресурс] / REX: информационное агентство. — Режим доступа: http://www.iarex.ru/news/25475.html. — Дата доступа: 10.05.2016.

9. Tulodziecki, G. Medien in Erziehung und Bildung. Grundlagen und Beispiele einer handlungs- und entwicklungsorientierten Medienpädagogik / G. Tulodziecki. — Bad Heilbrunn, 1997. — 120 p.

10. Информационные и коммуникационные технологии в образовании : монография / С. Князева [и др.] ; под ред. Б. Дендева — М. : ИИТО ЮНЕСКО, 2013. — 320 с.

11. Байков, А. Центральная Азия и перспективы СНГ / А. Байков, И. Болгова // Центральная Азия: актуальные акценты международного сотрудничества : сб. докл. МГИМО МИД России. — М., 2010. — С. 131–141.

***Media communication in the Eurasian Economic Union: a sphere approach to the analysis of interaction***

*The article is devoted to the study of the communication integration of the Eurasian Economic Union states. Four areas of interaction of the information systems of the Union states are singled out and consistently analyzed: a) the scope of the media, b) the sphere of legal regulation of the media, c) civil society, d) the system of media education. The processes in these areas affect the effectiveness of the formation of the unified media communication space of the EAEU.*